ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, ВУЧЫЦЕСЯ ПРАЦАВАЦЬ І ЖЫЦЬ ПА-КАМУНІСТЫЧНАМУ

**(З заклікаў ЦК КПСС да 1 мая 1966 года).**

Пралетарыя ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 14 (337) Пятніца, 22 красавіка 1966 года Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## ПАРТРЭТ

*Партрэтаў засталося шмат*
*І палкаводцаў і вучоных...*
*На іх кідаеш свой пагляд*
*То радасны, то засмучоны.*
*І паўстаюць перад табой*
*Далёкія часы і справы,*
*То з цяжкай, змрочнаю*
*журбою,*
*А то з кароткай яркай*
*славай.*
*Партрэтаў ведалі мы шмат*
*Яшчэ з маленства, ад*
*калыскі.*
*І вось спыняем свой пагляд*
*На самым дарагім*
*і блізкім.*
*З усмешкай чалавек на ім,*
*Аблічам — рускі.*
*Воблік — просты.*
*Не вылучаецца нічым —*
*Ні сілай волата, ні ростам.*
*Але яго не змерaць спраў*
*І параўнаць яго няма з кім,*
*Свайму народу ўсё ён даў,*
*Што толькі ў сне было*
*ды ў казках.*
*Ён скалануў стары сусвет,*
*Жыццё па-свойму*
*перайначыў.*
*Глядзім на Ленінскі*
*партрэт*
*І спраў сваіх бяссмерце*
*бачым.*

*Анатоль АСТРЭЙКА*

## ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

**Пяцітысячная** армія камсамольцаў нашага універсітэта, які носіць імя самага дарагога для нас чалавека на свеце, уключылася ў Ленінскую эстафету, прысвечаную 50-годдзю савецкай улады і 100-годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Эстафета стартавала. Яе дэвіз: «Жыць, як Ленін! Працаваць, як Ленін! Вучыцца, як Ленін». Выдатнай вучобай, прыкладнымі паводзінамі падцвярджаюць камсамольцы БГУ імя Ул. І. Леніна свае справы. Напярэдадні 96-годдзя з дня нараджэння Ільіча ва універсітэце разварнулася вялікая падрыхтоўка да гэтай даты. У яе ўключыліся грамадскія арганізацыі, камуністы, камсамольцы, студэнты, выкладчыкі.

**У Ленінскіх** пакоях інтэрнатаў, на агітпунктах і бібліятэках аформлены стэнды «Ул. І. Ленін», «Ленін і цяпер жывей усіх жывых», «Ленін з намі ва ўсіх справах і вучобе».

## НЯХАЙ МАЦНЕЕ СТУДЭНЦКАЕ СЯБРОЎСТВА

*Бадай, самай жывой формай камсамольскай работы з'яўляюцца «Агеньчыкі». Звычайна яны праходзяць з маладым захапленнем, весела, інакш кажучы, з «агеньчыкам».*

*Днямі студэнты аддзялення журналістыкі па ініцыятыве камітэта камсамола факультэта завіталі з дружбай да студэнтаў інстытута замежных моў і правялі сумесны паэтычны «Агеньчык», прысвечаны ленінскім дням. Дарэчы, гэта першы сумесны «Агеньчык» студэнтаў нашага універсітэта і студэнтаў педінстытута замежных моў. І трэба сказаць, што ён прайшоў выдатна.*

*Вершы пра Ільіча, якія чытала беларуская паэтэса Яўдакія Лось, выступленні ўдзельніка КВН Мінск—Масква Барыса Герстана, увага ўсіх прысутных да праграмы вечара, якую прыдумалі студэнт нашага універсітэта М. Варакса і студэнтка інстытута замежных моў Л. Стральцова — усё гэта стварыла абставіны вялікай радасці, садзейнічала таму, што пры развітанні гаспадары цёпла і шчыра сказалі:*

*— Нам вельмі спадабалася сустрэча, больш бы іх праводзілася паміж нашымі вузамі.*

*А. ТАБАЧНІКАЎ.*



УЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ ЛЕНІН.

## ЛЕНІН

Ленін быў ворагам цароў, памешчыкаў і капіталістаў, ворагам прыгнятальнікаў.

Ленін быў самым блізкім сябрам рабочых і работніц, сялян і сялянак, сябрам усіх працоўных.

Ленін быў сябрам прыгнечаных народаў, клікаў іх на барацьбу.

Ленін вёў усё жыццё мільёны рабочых і сялян на барацьбу супраць прыгнёту, за волю, за зямлю, за лепшую долю.

Ленін усё жыццё працаваў над стварэннем Камуністычнай партыі, якая павінна была ўказаць усім рабочым і сялянам шлях барацьбы, ісці ў гэтай барацьбе ў першых шэрагах.

Ленін узняў барацьбу супраць сусветнай грабежніцкай вайны, якую пачалі цары і капіталісты. Ён клікаў усіх працоўных ваюючых краін заключыць братні саюз. Ён клікаў іх узняцца супраць тых, хто пачаў гэтую вайну.

Ленін дапамог паўстаўшым рабочым і сялянам сваёй роднай краіны ўзяць уладу, дабіцца міру, узяць зямлю, фабрыкі і заводы. Ён дапамог рэспубліцы рабочых і сялян змагацца супраць ворага.

Ленін клікаў працоўных усіх краін аб'ядноўвацца, арганізоўвацца вакол баявога міжнароднага саюза рабочых — 111 Інтэрнацыянала.

Ленін клікаў узяўшых уладу рабочых і сялян сумесна будаваць сытае, здаровае, асветнае, светлае жыццё — сацыялізм.

## ЛЕНІНСКІЯ ЗАПАВЕТЫ

1. Мацаваць і надалей братні саюз рабочых і сялян .

2. Мацаваць і паляпшаць іх уладу — уладу Саветаў.

3 .Цясней згуртавацца вакол Камуністычнай партыі.

4. Быць верным міжнароднаму саюзу працоўных.

5. Змагацца супраць цемры, узбройвацца ведамі.

6. Агульнымі намаганнямі ўзнімаць гаспадарку краіны.

7. Аб'ядноўваць свае дробныя гаспадаркі праз кааперацыю.

8. Арганізаваць усім разам ва ўсім лепшы лад.

**ЗАЎСЁДЫ ІСЦІ НАПЕРАД,**
**ДА СВЕТЛАГА ЖЫЦЦЯ,**
**ДА САЦЫЯЛІЗМУ, ДА КАМУНІЗМУ!**
**ЗАПАВЕТЫ ЛЕНІНА ВЫКАНАЕМ!**

1924 год.

(З кнігі Н. К. Крупскай «Наш самы лепшы сябра»).

## РАЎНЕННЕ НА ІЛЬІЧА

Філалагічны факультэт першым уключыўся ў Ленінскую эстафету. У філолагаў заўсёды шмат планаў на будучае, але і зроблена нямала.

Ленінскія дні сустракаюцца тут, як правіла, цікавымі тэматычнымі вечарамі, традыцыйнымі сустрэчамі з вядомымі беларускімі паэтамі і пісьменнікамі, старэйшымі камуністамі і воінамі Савецкай Арміі.

Вось і цяпер адбыўся цікавы вечар — КВН з воінамі. Старанная падрыхтоўка прынесла перамогу студэнтам.

Ажыў у прадсвяточныя дні і інтэрнат па Паркавай магістралі. Радыёвузел арганізаваў канцэрты студэнцкай праграмы. Адбылася таксама цікавая сустрэча з беларускімі пісьменнікамі. Перад студэнтамі выступілі М. Арочка, А. Русак, Б. Спрынчан. Выйшла таксама новая фота-газета, дзе адлюстроўваецца жыццё і быт студэнтаў.

Але, бадай, самы заслужаны поспех у мастацкай самадзейнасці факультэта. Першае месца, заваяванае філфакам, гэта вынік стараннай працы самадзейных артыстаў.

Супала з днём Ленінскага юбілею і другая радасная падзея для філолагаў. Старэйшая рэспубліканская маладзёжная газета «Чырвоная змена» святкуе сваё 45-годдзе. Большасць супрацоўнікаў газеты — гэта выпускнікі аддзялення журналістыкі універсітэта. Ды і нашы студэнты частыя аўтары на старонках «Чырвонай змены». Сярод выхаванцаў філфака і рэдактар газеты Міхаіл Андрэевіч Суша. І таму не дзіўна, што камсамольцы-філолагі запрасілі да сябе ў госці сваіх старэйшых таварышаў па пяру.

З чыстым сумленнем, з вялікімі творчымі поспехамі сустракае сёння філалагічны юбілей вялікага Ільіча.

## НОВЫЯ КНІГІ ПРА Ул. І. ЛЕНІНА

1. **ВЕЧНО ЖИВОЙ.** Воспоминания современников о Владимире Ильиче Ленине. М., Политиздат, 1965. 367 с.
2. **ЛЕНИН В НАШЕЙ ЖИЗНИ.** Очерки. М., Политиздат, 1965. 415 с.
3. **ЗЕВИН В. Я. О НОВЫХ ЛЕНИНСКИХ ДОКУМЕНТАХ.** (К завершению издания Полного собрания сочинений В. И. Ленина). М., 1965. 64 с.
4. **МАРКСІЗМ-ЛЕНИНИЗМ — ТЕОРЕТИЧЕСКАЯ ОСНОВА СТРОИТЕЛЬСТВА КОММУНИЗМА.** М., «Высш. школа», 1965. 160 с.
5. **ВАСИЛЬЕВ О. М. РАЗРАБОТКА В. И. ЛЕНИНЫМ ПЛАНА СТРОИТЕЛЬСТВА СОЦИАЛИЗМА И КОММУНИЗМА В СССР.** Харьков Изд-во Харьков. ун-та, 1965. 171 с.
6. **ВОЛИН Я. Р. БОРЬБА В. И. ЛЕНИНА ПРОТИВ ОППОРТУНИЗМА, ЗА СОЗДАНИЕ И УКРЕПЛЕНИЕ ПАРТИИ НОВОГО ТИПА.** (1894—1904 гг) .Пермь, Кн. изд., 1965. 662 с.
7. **ЧЕРНЕЦОВСКИЙ Ю. М. БОРЬБА В. И. ЛЕНИНА ПРОТИВ КАУТСКИАНСКОЙ РЕВИЗИИ МАРКСИЗМА.** Л., Лениздат, 1965. 218 с.
8. **ЛОПАТКИНА В. С. О ПРОИЗВЕДЕНИИ В. И. ЛЕНИНА «О ПРАВЕ НАЦИЙ НА САМООПРЕДЕЛЕНИЕ И СОВРЕМЕННОСТЬ».** Саратов, Из-д-во Саратовск. ун-та, 1965 . 51 с.
9. **САПРЫКИН Ю. М. ОСНОВНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОРИИ ФЕОДАЛЬНОГО ОБЩЕСТВА В ТРУДАХ В. И. ЛЕНИНА.** М., Изд-во Москов. ун-та, 1965. 74 с.
10. **ЛУКИН Ю. В. И. ЛЕНИН О ХУДОЖНИКЕ И ХУДОЖЕСТВЕННОМ МАТСЕРСТВЕ.** М., «Знание», 1965. 32 с.

# РАПАРТУЕ КАМСАМОЛІЯ БДУ ІМЯ Ул. І. ЛЕНІНА

☆ ☆ ☆ ☆ ☆

## СФАРМІРУЕМ ДВА ЦАЛІННЫЯ АТРАДЫ

Шмат выдатных традыцый ёсць у камсамольцаў матэматычнага факультэта. Вясной правялі працоўную эстафету, якую прысвяцілі Ленінскай чатырохгодцы.

У гэтыя дні ў нас праводзіцца навуковая студэнцкая канферэнцыя. Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у рабоце матэматычных канферэнцый у Новасібірску, Кіеве і Адэсе.

А ў першамайскія дні студэнты-матэматыкі зробяць цікавыя падарожжы па партызанскіх дарогах.

Асабліва многа старання камсамолія матфака прыдае працоўнаму выхаванню. Таму не дзіўна, што тут ідзе фарміраванне двух працоўных атрадаў, якія неўзабаве паедуць на будоўлі цаліны.

**В. БУБНОЎ.**

## ЛЕНІН—ПРЫКЛАД ВА ЎСІМ

Гістарычны факультэт лічыцца адным з лепшых ва універсітэце. Тысячы яго выхаванцаў працуюць зараз у школах нашай краіны, вучацца ў аспірантуры, сталі дактарамі і кандыдатамі навук. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта, аспіранты, студэнты, члены таварыства «Веды» напярэдадні XXIII з'езда КПСС прачыталі каля пяцідзесяці лекцый, дакладаў для насельніцтва калгасаў, саўгасаў і прадпрыемстваў аб гісторыі Камуністычнай партыі, аб слаўных старонках яе жыцця.

Не адстаюць ад сваіх настаўнікаў і студэнты. Нядаўна пяцікурснікі-выпускнікі факультэта атрымалі накіраванні на работу, як высокакваліфікаваныя спецыялісты, панясуць яны свае веды людзям.

А студэнты, што засталіся вучыцца ва універсітэце будуць памнажаць і захоўваць тыя выдатныя традыцыі, якія пакінулі ім у спадчыну іх таварышы. Камсамолія факультэта адна з першых ва універсітэце ўключылася ў старт Ленінскай эстафеты. Многа карыснага, новага зроблена за гэты час у групах, на курсах. Асаблівае старанне прыкладваюць тут студэнты на авалоданне багатай крыніцы тэарэтычнай спадчыны Ул. І. Леніна. На семінарскіх занятках нельга не заўважыць узросшай цікавасці студэнтаў факультэта да першакрыніц Ільіча.

Напярэдадні свята ў камсамольскіх групах прайшлі тэарэтычныя семінары і канферэнцыі. Студэнты, аспіранты, выкладчыкі гістфака горача адабраюць рашэнні XXIII з'езда КПСС.

На сходах камсамоліяй прынята рашэнне — поўнасцю авалодаць тэарэтычнай спадчынай Ільіча. З гэтай думкай у інтэрнаце, дзе жывуць гісторыкі, арганізаваны перадачы па студэнцкаму радыёвузлу апавяданняў, цікавых старонак з жыцця Ул. І. Леніна, выступленні ў насценным друку.

Сёння ў камсамольцаў гістфака адбудзецца вечар, на які прыйдуць старэйшыя члены Камуністычнай партыі, удзельнікі грамадзянскай вайны. Сярод іх будуць людзі, якія бачылі Ільіча, стваралі партыю бальшэвікоў.

Студэнты раскажуць ім аб сваім жыцці, вучобе, надзённых клопатах. Гісторыкі таксама чакаюць гасцей з горада-героя. Крыніцы рускай рэвалюцыі — Ленінграда, а таксама Адэсы, Кіева.

**С. КАЛАНТАЙ.**

## ПЕРАМОЖАМ БІЁЛАГАЎ!

Камсамольцы хімфака сустракаюць ленінскія дні мноствам самых розных мерапрыемстваў. Актыўна ўключыўшыся ў Ленінскую эстафету, камсамольцы факультэта стварылі спецыяльны штаб, які будзе кіраваць усімі мерапрыемствамі, што будуць праводзіцца у групах, на курсах у гэтыя знамянальныя дні. Каб з яшчэ большым энтузіязмам вывучаць спадчыну Ільіча і кіравацца заўсёды ў жыцці яго запаветамі, бюро камітэта камсамола вынесла на абмеркаванне студэнтаў прапанову аб выкліку на спаборніцтва за лепшыя паказчыкі ў вучобе біялагічны факультэт.

Хлопцы і дзяўчаты горача падхапілі гэтую прапанову. І вось першы поспех. Упершыню студэнты-хімікі ў гэтым годзе ўдзельнічалі ў аглядзе мастацкай самадзейнасці. Шмат сіл і старання прыклалі арганізатары гэтага пачынання Тоня Вераб'ёва і Жана Малашэвіч. Іх ініцыятыва не прапала дарма. На сцэну выйшлі хімікі-салісты, хімікі-музыканты. І хоць самадзейныя артысты факультэта занялі далёка не першае месца, але затое пачатак ёсць і ў нас, і мы ўпэўнены, што ў будучым годзе наша самадзейнасць заявіць аб сабе ва ўвесь голас.

Лепшыя камсамольцы факультэты будуць занесены ў кнігу «Слаўных спраў камсамоліі факультэта», якую рашылі завесці хімікі.

Імя Ільіча на вуснах кожнага студэнта. У інтэрнаце, што па вуліцы Свярдлова, студэнцкі савет з дапамогай камсамольскага актыву факультэта рыхтуецца да вечара «Усё жыццё, справы, вучобу—раўняць па Ільічу».

**В. КЛІМОВЕЦ.**



Ул. І. ЛЕНІН і камсамольцы.
Аўталітаграфія М. КЛЁНСКАГА.

## ВЫВУЧАЕМ БІЯГРАФІЮ ЛЕНІНА

**Па-асабліваму сустрэлі Ленінскія дні студэнты падрыхтоўчага факультэта нашага універсітэта. Акрамя планавай палітыка-выхаваўчай работы была праведзена экскурсія ў бібліятэку імя Ул. І. Леніна. Сумесна з таварыствам «Дружба» на факультэце арганізоўваецца кіналекторый аб Ільічу. Перад студэнтамі факультэта выступілі старыя камуністы, Елена Анатольеўна Мар'ясава і іншыя, якія асабіста бачылі жывога Ул. І. Леніна. Сіламі студэнтаў падрыхтоўчага факультэта пачалося будаўніцтва на тэрыторыі універсітэцкага гарадка спартыўнай пляцоўкі з комплексам спартыўных збудаванняў. На факультэце аформлены стэнд «Біяграфія Ул. І. Леніна». Выйшаў таксама спецыяльны нумар насценнай газеты, прысвечаны 96-годдзю Ул. І. Леніна. Многія студэнты замежных краін запрашаюцца ў школы горада, каб там асабіста прыняць удзел у святкаванні гэтай знамянальнай падзеі.**

## ЗАЎСЁДЫ З ІМ

Паспяхова стартуе Ленінская эстафета на юрыдычным факультэце. Узяўшы дэвіз, — «Ул. І. Ленін прыклад для нас і у вучобе, і ў працы, і ў жыцці» — юрысты з асаблівым стараннем вывучаюць жыццёвы шлях Ільіча.

Навуковыя студэнцкія гурткі ў гэты дзень сталі цэнтрам цікавых дыскусій, спрэчак, рэкамендацый, як лепш падыйсці да вывучэння той ці іншай першакрыніцы Леніна. Удзел студэнтаў у навуковай рабоце выхоўвае у юнакоў і дзяўчат творчыя адносіны да вучобы, павышае інтарэс да сваёй будучай прафесіі.

Як старанна і глыбока вывучаюць тут першакрыніцы Ільіча, можна прасачыць з наступнага. Нядаўна на факультэце прайшла навуковая канферэнцыя, якая спецыяльна была прысвечана вывучэнню работ Леніна «Аб дзяржаве», «Аб праве», а таксама некаторых прац па нацыянальнаму пытанню. На канферэнцыі было прачытана шмат дакладаў, многія студэнты ў спрэчках выказалі слушныя прапановы, якія накіраваны на неабходнасць яшчэ глыбей узяцца за вывучэнне спадчыны правадыра.

На канферэнцыі запрашаюцца таварышы з іншых інстытутаў рэспублікі. Цяпер іх гасцямі — студэнты Харкаўскага юрыдычнага інстытута, а таксама юрысты Маскоўскага універсітэта.

А сёння, у гэтую знамянальную дату, вялікая група самадзейных артыстаў факультэта выехала у госці з канцэртамі да сваіх дружбакоў — воінаў Савецкай Арміі. Камсамольцаў юрфака звязвае з воінамі даўняя дружба. Дый не сакрэт, большасць студэнтаў факультэта — гэта у мінулым воіны.

**Р. САЛАНОВІЧ.**

## ЛЕНІН УСЮДЫ З НАМІ

На геаграфічным факультэце ідзе старанная падрыхтоўка да агляду насценнага друку, якому так многа ўвагі ўдзяляў Ільіч. За апошні час узрасла дзейнасці такіх газет, як «Спартсмен геафака», «Географ», «Даследчык». Нельга не адзначыць таксама майстроў самадзейнасці геаграфічнага. Трэцяе прызавое месца. Гэта неблагая ўдача. Усяго за апошні час географамі пастаўлена адзінаццаць канцэртаў. Студэнты былі частымі гасцямі ў калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах.

Асабліва цесная дружба існуе паміж камсамольцамі геафака і падшэфным калгасам «Камунар» Дзяржынскага раёна, дзе студэнты з'яўляюцца частымі і жаданымі гасцямі хлебаробаў.

Ленінскія дні географы адзначаюць згуртаванай працай, добраўпарадкаваннем студэнцкага стадыёна. На працу выйшла больш як 150 чалавек.

20 красавіка адкрылася навуковая канферэнцыя з удзелам студэнтаў іншых вну краіны. Да нас у госці прыехалі студэнты Прыбалтыкі, Масквы, Ленінграда, Кіева, Баку, Ерэвана і многа іншых гарадоў нашай краіны. На канферэнцыі ідзе гарачая спрэчка аб тым, як глыбеі пазнаваць законы навукі, як лепш вучыцца, каб быць высокакваліфікаванымі спецыялістамі на вытворчасці.

*Н. САДОЎСКІ.*

## ЗАПАВЕТАМІ ПРАВАДЫРА

У сучасны момант юнакоў і дзяўчат біяфака хвалюе шмат пытанняў, якія ставіць перад імі само жыццё. А жыццё патрабуе ад біёлагаў ініцыятывы, улюбёнасці ў навуку. Каб ісці ў нагу з жыццём, трэба ведаць усе яго запатрабаванні, яго асаблівасці. На ўсе хвалюючыя пытанні і адказвае анкета, якую стварылі нядаўна члены бюро факультэта. Яна дасць магчымасць значна палепшыць навучальны працэс, самападрыхтоўку студэнтаў у нелекцыйны час.

Правядзенне канферэнцыі, якая прысвечана 96-й гадавіне з дня нараджэння Ільіча, дае магчымасць яшчэ глыбей пазнаць жыццёвы шлях правадыра.

Факультэцкія артысты занялі 4 месца ў аглядзе мастацкай самадзейнасці. Біёлагі таксама часта выязджаюць з канцэртамі ў калгасы і саўгасы Барысаўскага раёна.

**Б. КАСЦЮК.**

## ДАСТОЙНА ВЫКАНАЕМ ЧАТЫРОХГОДКУ!

За апошнія гады камсамольская арганізацыя фізічнага факультэта накапіла станоўчы вопыт выхавання студэнтаў на ленінскіх прыкладах. І калі была аб'яўлена ва універсітэце Ленінская чатырохгодка, камсамолія фізікаў горача адгукнулася на яе і ўключылася ў спаборніцтва за дастойнае яе выкананне. Юнакі і дзяўчаты выйшлі на суботнік. З рыдлёўкамі і насілкамі прыйшлі яны на тэрыторыю Палаца спорту, каб упрыгожыць яго.

У гэтыя дні ў групах і на курсах праходзяць камсамольскія сходы пад дэвізам «Ленін заўсёды з намі!» Ідэалагічны сектар камітэта камсамола факультэта падрыхтаваў стэнд «Ленін і рэвалюцыя». Камсамолія таксама даўно ўжо збірае здымкі і матэрыялы, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці Ул. І. Леніна, аб сваіх дасягненнях з таго дня, калі была прынята Ленінская эстафета.

І. ДУДУК.

## ЦІКАВАЯ КНІГА

Пры вывучэнні раздзелаў па гісторыі КПСС, у якіх гаворка заходзіць аб рабочым і сацыял-дэмакратычным руху ў Расіі у 1914 годзе, студэнты знаёмяцца з пазіцыяй, якой прытрымліваліся партыі II Інтэрнацыянала ў адносінах да першай імперыялістычнай вайны. Лідэры многіх партый II Інтэрнацыянала, як вядома, здрадзілі справе рабочага класа, яго інтарэсам, адмовіліся ад сваіх ранейшых рашэнняў і абяцанняў, выступілі ў абарону імперыялістычнай буржуазіі, якая развязала вайну. Гэтую здраду сацыял-дэмакратычных партый рабочаму класу Ул. І. Ленін назваў крахам II Інтэрнацыянала і заклікаў рэвалюцыйных марксістаў стварыць новы інтэрнацыянал, свабодны ад сацыял-шавінізма, ад апартунізма.

Такі інтэрнацыянал, у якім аб'ядналіся маладыя тады камуністычныя партыі, і быў створан пры актыўным удзеле Ул. І. Леніна ў сакавіку 1919 года. У некаторых наступных тэмах курса студэнты знаёмяцца ўжо з дзейнасцю III Камуністычнага Інтэрнацыянала, з яго важнейшымі рашэннямі, заслугамі перад сусветным рэвалюцыйным рухам.

А як павялі сябе ў той час лідэры II Інтэрнацыянала? Якія існуюць сувязі паміж сацыял-дэмакратычнымі партыямі зараз і якіх поглядаў прытрымліваюцца кіраўнікі гэтых партый па важнейшых пытаннях сусветнага развіцця? Кніжка загадчыка кафедры гісторыі КПСС нашага універсітэта В. М. Сікорскага «Сусветны рэвалюцыйны працэс і сучасны сацыял—рэфармізм» дае адказ на ўсе гэтыя пытанні. У ёй раскрываецца сутнасць гора—тэарэтыкаў сучаснага сацыял-рэфармізму, яскрава паказваецца, што у ацэнцы важнейшых праблем сучаснага развіцця грамадства лідэры сацыял-дэмакратыі стаяць на антыгістарычных пазіцыях.

Пасля заканчэння першай сусветнай вайны лідэры былога II Інтэрнацыянала, зцвярджаўшыя, што вайна проста перашкодзіла гэтаму міжнароднаму аб'яднанню выканаць свае абавязкі, пастараліся ажывіць «труп» II Інтэрнацыянала. Гэта было зроблена правымі лідэрамі сацыял-дэмакратыі на канферэнцыі у Берне ў лютым 1919 года.

У перыяд паміж двума сусветнымі войнамі сацыял-дэмакратычныя лідэры, фармальна застаючыся на пазіцыях марксізма, распаўсюджвалі тэорыі, якія у корані супярэчылі марксізму, прыстасоўвалі палітыку сацыял-дэмакратыі на службу інтарэсам капіталістаў ва ўмовах агульнага крызіса капіталізма.

У новых абставінах пасля другой сусветнай вайны правае сацыял-дэмакратычнае кіраўніцтва поўнасцю звязала свой лёс з абаронай інтарэсаў імперыялізму, яно адраклося не толькі фактычна, але і фармальна ад марксізма, ці замяніла яго дактрынай «дэмакратычнага сацыялізму».

Вымушаныя зрабіць перапынак у сваёй дзейнасці ў перыяд другой сусветнай вайны, правыя лідэры сацыял-дэмакратыі ў чэрвені 1951 года зноў, ужо ў трэцім выданні, аднавілі II Інтэрнацыянал, на гэты раз пад мадэрнізаванай назвай «Сацыялістычны Інтэрнацыянал» (Сацінтэрн). У гэтую арганізацыю зараз уваходзяць 42 сацыял-дэмакратычныя партыі.

Ужо у 1951 годзе Сацінтэрн прыняў франкфуртскую дэкларацыю. Пасля прыняцця гэтай дэкларацыі фактычна пачынаецца працэс заключальнага духоўнага і праграмнага перахода сацыял-дэмакратызма ў разнабаковасць буржуазнай ідэалогіі.

На працягу 50—60 гадоў вядучыя сацыял-дэмакратычныя партыі краін Заходняй Еўропы прынялі новыя праграмныя дакументы, галоўная накіраванасць якіх — адмаўленне ад марксісцкага аналізу сучаснага грамадства, ад сацыялістычных мэт і задач.

Вынік ідэйнага пераўзбраення сацыял-дэмакратызма быў падведзен на сесіі савета у Осла ў чэрвені 1965 года. Была прынята новая дэкларацыя Сацінтэрна пад гучнай назвай «Мір сёння. — Сацыялістычная перспектыва». У гэтай дэкларацыі лідэры Сацінтэрна спрабавалі неяк даць адказ на праграмныя дакументы міжнароднага камуністычнага руху — Маскоўскую дэкларацыю 1957 года і Маскоўскую Заяву 1960 года, а таксама на новую Праграму КПСС.

У сваім даследаванні В. М. Сікорскі выяўляе сутнасць рашэнняў Сацыялістычнага Інтэрнацыянала і некаторых заходнееўрапейскіх сацыял-дэмакратычных партый, на аснове канкрэтных фактаў робіць вывады, што цяперашні рэфармізм і пры ацэнцы сучаснай эпохі, і пры характарыстыкі пытанняў вайны і рэвалюцыі, нацыянальна вызваленчай барацьбы народаў, а таксама ў пытаннях аб будучым чалавецтва, у выбару шляхоў грамадскага развіцця ператварыўся у разнабаковасць буржуазнай ідэалогіі. Аўтар паказвае сутнасць крызіса рэфармізма, падрабязна спыняецца на некаторых асаблівасцях барацьбы камуністычных партый капіталістычных краін за пераадольванне ў рабочым руху раскола ў сучасных умовах.

Кніга В. М. Сікорскага—глыбокае даследаванне. Аўтар аналізуе вялікую колькасць работ, што непасрэдна адносяцца да гэтай тэмы. Кніжка напісана даходлівай літаратурнай мовай. У ёй ёсць шмат абагульненняў, каштоўных вывадаў. Пераказваць змест, даследаванне няма магчымасці, дый, відаць, гэта не патрэбна. Мы раім усім, хто цікавіцца праблемамі сучаснага развіцця грамадства, прачытаць гэтую кніжку

**Г. Г. ГЕРАСІМЕНКА,**
**кандыдат гістарычных навук.**

В. а. рэдактара
У. КУЛАЖАНКА.

АТ 00882 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 576.